У III Саборы БАПЦ не прыняла ўдзелу Парахвія БАПЦ сьв. Апосталаў Пятра і Паўла ў Адэлайдзе, Аўстралія, дзе запанавала неразьбярыха. Ня было рэпрэзэнтацыі і ад Сэрбскай Парахвіі ў Барбэнтоне, ЗША, дзе згодна інфармацыі сьвятара а. А. Родэнковіца згарэла царква і парахвія расфармавалася. (Згодна пазьнейшай інфармацыі, двух адшчэпнікаў з Кліўленду прыехалі да а. Родэнковіча і ашуканствам атрымалі ад яго подпіс на ўпаўнаважаньні на так-званы адшчэпніцкі „Сабор" у Гайленд Парку. Адшчэпнікі пераканалі а. Родэнковіча, што закалот у БАПЦ больш не йснуе й а. Родэнковіч поўнасьцяй спадзяваўся, што Ўладыка Ізяслаў будзе на „Саборы" ў Гайленд Парку. Заўважыўшы сваю памылку, а. Родэнковіч потым перапрасіў Уладыку Ізяслава й прыслаў грошы /складку/ ад свае парахвіі да Кансысторыі. *– рэдакцыя).* Што-ж датычыць парахвіі сьв. Духа ў Дораты, Н. Дж., ЗША, дык яна ня лічыцца на сьпіску Парахвіяў БАПЦ ад часу, калі яе былы кіраўнік, Карп Стар, быў растрыжаны і папаў пад суд. Таксама збунтаваныя парахвіі ў Кліўлендзе, ЗША, і ў Дэтройце, ЗША, як і збунтаваныя часткі парахвіяў у Гайленд Парку, і ў Таронта, часова ня фігуруюць на сьпіску Парахвіяў БАПЦ – ніводная з іх ня можа быць браная пад увагу пры ўстанаўленьні кворуму на III Саборы БАПЦ. Такім чынам на Саборы адсутнічала толькі адна Парахвія БАПЦ з Адэлайды, Аўстралія – 3 галасы. Тады ўсіх магчымых галасоў было 42, з чаго рэпрэзэнтаваных на Саборы ў Ман-



На Саборы выступае Мітр. Прат. а. Янка Абабурко





Працуе Мандатная Камісія

© PDF: Kamunikat.org 2018 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018

© PDF: Kamunikat.org 2018

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018


Сьвятары Б.А.П.Ц. асабіста прысутныя на Сабры. Зьлева направа: Мітрафорны Пратаерэй Янка Абабурко з Англіі, Пратаерэй Ян Пекарскі з Англіі, Протапрасьвіцер А. Кулакоўскі з Аўстраліі і Ерэй Максім Таўпека з Канады.

чэстары было 39, або 93%; вымаганы Статутам мінімум для кворуму 50%. Гэта азначае, што Сабор быў поўнаправўным, ды быў-бы такім навет калі-б лічыць і ўсе збунтаваныя парахвіі!

Першы дзень працы Сабору

Першы дзень працы III Звычайнага Сабору БАПЦ пачаўся малебенам, пасьля якога гаспадар царквы Жыровіцкае Божае Маці і Кіраўнік Парахвіі, Мітр. Прат. Ян Абабурка, сардэчна вітаў усіх прыбыўшых на Сабор здалёку і зблізку духоўных, дэлегатаў і гасьцей ды запрасіў Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіепіскапа Ізяслава заняць месца за прэзыдыяльным сталом. Уладыка тут-жа паклікаў да парадку і адчыніў Трэйці Звычайны Сабор Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы на чужыне кароткім уступным словам і хвілінай цішыні для ўшанаваньня памяці адыйшоўшых у вечнасьць, сьв. пам. Мітрапаліта Андрэя, Арх. Васіля, Арх. Сергія і ўсіх нашых сьвятароў. У Прэзыдыюм былі пакліканыя ўсе духоўныя, а з вернікаў сп. М. Віценчык, сп. Я. Гралеўскі і два сакратары – сп. Я. Калбаса і сп. П. Манькоўскі. Быў зацьверджаны склад трох Камісіяў – Мандатнай, Рэзалюцыйнай і Статутовай, якія ўжо працавалі.

Прыняўшы парадак дня нарадаў на ўсе тры дні, прысутныя праслухалі прысланыя Сабору прывітаньні і выступленьні з вітаньнямі і пажаданьнямі ўдачы – індывідуальныя і ад арганізацыяў, ад людзей, што хварэюць душою за сваю Царкву і Яе лёс. Наступна быў прачытаны, перадыскутаваны і прыняты пратакол II Сабору БАПЦ з 1972 году.

Выбраны новы МІТРАПАЛІТ БАПЦ

Пасьля ўладжаньня ўсіх справаў фармальнага значэньня Сабор урэшце змог прыступіць да галоўнага пункту парадку першага дня нарадаў – да выбару Першагерарха. Справа, бязумоўна, ня выглядала дужа складанай, паколькі быў усяго адзін кандыдат. Затое погляды разышліся ў пытаньні тытулу, які Сабор мае яму надаць. Адны ўважалі, што трэба нам быць пасьлядоўнымі і трымацца створанай ужо традыцыі, надаючы Першагерарху тытул Мітрапаліта. Другія радзілі пачакаць, або аддаць справу на вырашэньне духавенству. Пасьля ажыўленай, хоць і зусім спакойнай дыскусіі, усё-ж Сабор аднагалосна выказаўся за першую канцэпцыю ды на прапанову вядучага Старшыні а. Аляксандра абвесьціў нашага Першагерарха Ўладыку Ізяслава, МІТРАПАЛІТАМ пад дружны воклік – Аксіос! Аксіос! Аксіос!

На завяршэньне першага дня працы Сабору Ўладыка Мітрапаліт прачытаў рэфэрат на тэму „Падзеі апошніх год і сучасны стан БАПЦ", а юрысконсул В. Гарошка злажыў інфармацыю пра стан судовых справаў, ведзеных ім ад імя Кансысторыі, і адказаў на пытаньні дэлегатаў.

Другі дзень працы Сабору

Другі дзень Сабору пачаўся ўрачыстай Архірэйскай Літургіяй, якую правіў Яго Выс. Уладыка Мітрапаліт у асысьце прысутнага на Саборы духавенства пры перапоўненай вернікамі царкве. Сьпяваў на дзіва добра сьпеты, моцны хор, ствараючы праўдзіва ўзьнёслы настрой. Пасьля сьв. Літургіі была адслужаная Паніхіда з нагоды першых угодкаў сьмерці сьв. пам. Мітрапаліта Андрэя.

Пасьля Божае Службы мясцовае Сястрыцтва зарганізавала шчодры пачастунак для ўдзельнікаў Сабору і гасьцей. Пасіліўшыся, прысутныя праслухалі з увагай рэфэрат раднага БАПЦ П. Манькоўскага на актуальную тэму „Заходняя Царква і Беларусы". Рэфэрат узбудзіў у слухачоў жывое зацікаўленьне.

Каля гадзіны 3-цяй па п. Сабор прыступае да далейшае працы. На парадку дня справаздачы: (а) Сакратара Кансысторыі Протапр. В. Кендыша, які па прычыне хваробы змог падрыхтаваць толькі кароткі накід падзеяў у БАПЦ ад 1972 году, што было ўзята пад увагу, але не чыталася. (б) Скрбніка Кансысторыі, сп. П. Манькоўскага, які прадставіў фінансавую дзейнасьць Кансысторыі за час ад верасьня 1982 году да травеня 1984 году. Скарбнік сьцьвердзіў, што фінансы нашай Царквы ёсьць у стане крытычным і заклікаў усіх да большай ахвярнасьці. (в) Кантрольнай Камісіі ў складзе др. Р. Гарошкі і сп. А. Нэстара; апошні прачытаў справаздачы з праведзенай Камісіяй кантролі галоўна фінансавай гаспадаркі Царквы, з якое вынікае, што Камісія знайшла справаводзтва ў парадку, ня выявіла ніякіх злоўжываньняў грашыма і прапануе ўсім тым, хто ахвярна працаваў дзеля павялічэньня фінансавай базы нашай Царквы падзяку ад Сабору. Прапанова прынята аднагалосна.




Здымкі з Багаслужбы ў Мачэстары



Сьпявае царкоўны хор

Выбраныя новая Рада БАПЦ і Кантрольная Камісія

Наступным пунктам Сабор устанавіў новы склад Рады БАПЦ. Ад духавенства ў яе ўваходзяць: Яго Выс. Ўладыка Мітрапаліт Ізяслаў, Протапр. А. Кулакоўскі, Протапр. В. Кендыш, Протапр. др. А. Смаршчок, Мітр. Пр. Я. Абабурка, Прат. Я. Пекарскі, Ерэй М. Таўпека. Ад вернікаў: Д. Курыловіч, У. Курыла, В. Лосік, А. Лысюк, П. Манькоўскі, М. Войтэнка, а на месца выбыўшых па здароўю А. Шастака і М. Тулейкі былі дабраныя Я. Ясьвілцвіч з Лёндану і М. Нэстар, ЗША. Новая Кантрольная Камісія: др. Р. Гарошка, А. Нэстар і Л. Войтэнка.

Апошнім пунктам нарадаў другога дня Сабору былі папраўкі і зьмены да Статуту БАПЦ з мэтай выпраўленьня і ўдакладненьня ранейшага тэксту, павялічэньня аўтарытэту Правячага Епіскапа Епархіі, Сабору Епіскапаў, як і Кіраўніка Парахвіі, запабяжэньня бунтам, змаганьня з адшчэпнікамі, і т.п.. Сабор унёс шмат папраўак і дапаўненьняў у 27 параграфаў Статуту Царквы. Між іншым было пастаноўлена, што Звычайныя Саборы БАПЦ будуць склікацца не што 12, а што 6 гадоў.

Трэйці дзень працы Сабору

Трэйці і апошні дзень нарадаў III Сабору пачаўся а гадзіне 10 раніцы кароткай прынагоднай малітвай

(працяг на 8-й бачынцы)

© PDF: Kamunikat.org 2018
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018

© PDF: Kamunikat.org 2018 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018

КАЛЯДНАЕ АРХІПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАНЬНЕ
Усячэснаму Сьвятарству й Багалюбным Вернікам Беларускае Аўтакефалснае Праваслаўнае Царквы

Дарагія ў Хрысьце Браты й Сёстры!

„Слава на вышынях Богу і на зямлі мір сярод людзей добрае волі" (Лук.2,13). Ангелы абвясьцілі людзям вялікую радасьць і мір на зямлі яшчэ тады, калі нарадзіўся Госпад славы – Хрыстос Бог. Той, Хто вякі стварыў і ад вечнасьці прыгатовіў нам спасеньне, зьявіўся, як Дзіця, на зямлі, каб аднавіць старасьць нашае прыроды. Ужо, як Дзіця, застрашыў уладароў зямлі, бо нават Цар Ірад, пачуўшы аб Яго нараджэньні, занепакоіўся і ўвесь Ерусалім з ім (Мц.2,3). Такая сіла нашага Агнца-Дзіцяці, такая непераможная сіла Божага Дзіцяці, з якою Ён нараджаецца! Нараджаецца Ён разам і з розумам, бо Той, Хто мае ў дзяцінстве Сваім сілу, Той мае і розум. „Вялікі Госпад Наш і вялікае сілы, розум Ягоны няшчысьлёны" (Пс.146,5). Нараджаецца нам і Дзіця і старадаўны днямі, Дзіця і (разам) Айцец, бо аб нараджэньні Ягоным гаворыць прарок Ісая: „Айцец будучага веку".

Нараджэньне Ісуса Хрыста сустрэлі з радасьцю ўсе людзі добрае волі, як Віфлеемскія пастухі ды нават цары з усходу прышлі пакланіцца Яму й прынесьлі свае дары. Сьвята Нараджэньня Хрыста надае й нам новы пачатак, бо з нараджэньнем Госпада сьвет пачаў жыць новым жыцьцём. Той, аб Якім прарокі прадвяшчалі праз вякі, нарадзіўся, каб вывесьці род людзкі з пад улады князя сьвету гэтага, князя цемры.

Нараджэньне Гасподняе ёсьць Сьвята спасеньня створанае Хрыстом, Які прынёс справядлівасьць, любоў, свабоду і мір. Ніхто ня можа зьнішчыць радасьць Нараджэньня Хрыста, бо яна дзее ў душы людзей, а душа ёсьць несьмяротная, яна не ўмірае.

Хрыстос нарадзіўся, каб людзтва зволыніць ад кайданаў грэху й завесьці яго на вышыні духоўныя. Ён прыйшоў устанавіць мір у нашых душах і сэрцах, мір у нашых дамох і на сьвеце.

Мы ведаем, што ў многіх частках сьвету няма супакою, а ў сэрцах многіх людзей няма ласкі, прыхільнасьці, спрыяньня й зычлівасьці. На сьвеце цяпер пануе натуга, беспарадак, няпэўнасьць. Людзі стала жывуць пад пагрозай, у страху за сваё жыцьцё. Наш супольны вораг імкнецца заваяваць сьвет сваёй зьнішчальнай ідэалогіяй.

Мы з болем у сэрцы перажываем нязгоды ў нашай Царкве й молім усеміласьцівага Спаса, каб паслаў мір для ўсіх нас.

Успамінаючы калішнія сьвяткаваньні нашыя на Бацькаўшчыне, мы павінны злучыцца духам з нашымі роднымі праваслаўнымі хрысьціянамі, каб урачыста й тут сьвяткаваць, узносячы нашыя шчырыя малітвы й служэньні Ўсемагутнаму Богу за супакой у сьвеце й лепшую долю для нашага паняволенага Беларускага Народу.

Мы патрабуем Божага кіраўніцтва й дапамогі як асобы і як народ. Філасофія моцнага й бязлітаснага матэрыялізму атручвае душы нашых людзей. Сьвятое імя Бога ёсьць зьняважанае.

У гэты Сьвяты Дзень, зьвернемся нашымі сэрцамі й розумам да Князя Міру – Хрыста, каб узнавіць нашыя рэлігійныя перакананьні, ажывіць нашу веру і ўзмацніць нашыя маральныя вартасьці і адвагу, каб устаяць супраць падступнага міру на сьвеце, і паказаць сваю дзейнасьць дзеля міру Хрыстовага.

Вітаем усіх з Вялікім Сьвятам – Нараджэньнем Госпада нашага Ісуса Хрыста й жадаем шчодрых ласкаў ад Усёшчодрага Госпада Бога.

Хрыстос нарадзіўся, Яго слаўце!

Данае ў сьнежні
лета Божага 1984.

Пакорны Мітрапаліт Ізяслаў
Першагерарх Б.А.П.Ц.

Выясьненьне й Перасьцярога

Днямі папала нам у рукі лістоўка, зробленая на блянку з загалоўкам „Рт. Рэв. Арчбішоп Мікалай", „архіпастырскае пасланьне" і падпісаная „З Божае ласкі архіяпіскап Мікалай Першы Герарх БАПЦ". Яно можна было-б зусім зыгнараваць гэту пісаніну чалавека, ці то псыхічна хворага, ці страціўшага рэшткі сумленьня, якому карціць ашукаць Бога і людзей, але дабро нашай Сьвятой Царквы вымагае выпрастаць тое, што ён так лоўка павыкрыўляў.

На пачатку свае лістоўкі М. Мацукевіч кажа, што „Царква гэта ёсьць збор людзей веруючых у Хрыста і Ягоную Навуку" (апіскі выпраўленыя намі) і мы цешымся, што ён гэта ўрэшце зразумеў. Але ён ня піша, што рабіць з тымі, хто толькі на словах за Хрыста, а ўчынкамі сваімі Яго дзень у дзень забіваюць, расьпінаюць на крыжы. А што ён сам адзін з такіх, ня можа быць найменшага сумленьня, бо яму было даведзена чорна на белым – за гэта ён пазбаўлены сану і адлучаны ад Царквы. Мацукевіча ніхто не пакрыўдзіў: сам ён пакрыўдзіў сябе, перш пакрыўдзіў Хрыста.

Далей у лістоўцы ён піша пра Саборы Царквы, на якіх, паводля яго, „вырашаліся насьпелыя праблемы". Гэта, як ведама, ня зусім так, бо тыя Саборы разглядалі не справы людзкія, а справы Веры і Царквы. Саборы замацоўвалі традыцыі Царквы ды ўстанаўлялі правілы-каноны, якія забавязваюць усіх па сяньняшні дзень. Два з тых правілаў (Ап.Пр.34,35) кажуць епіскапу, каб ня сьмеў распараджацца ў чужой епархіі пад пагрозай утраты свае ўласнае епархіі і сану. Мацукевіч колькі разоў дапусьціўся гэтага праступку, прычыніўшы нашай Сьв. Царкве вялікую шкоду цераз бунты і раскол – і атрымаў, на што заслужыў. Але ён і ня думае каяцца ў сваіх цяжкіх грахох: вось ужо другі год, як ігнаруе пастановы Сабору Епіскапаў і не астаўляе збунтаваных парахвіяў, бо быццам яго „людзі хочуць", уводзячы так у жыцьцё Царквы элемэнты народаўладзтва, што ёсьць поўная ерась. Гэтым ён найбольш і карыстаецца ў сваёй разбуральнай дзейнасьці.

Як ведаем, на Паведамленьне Кансысторыі ад 11/I/84 пра скліканьне 3-га Звычайнага Сабору БАПЦ ў Манчэстары, Англія, Мацукевіч і яго кліка адказалі скліканьнем свайго прыватнага псэўдасабору ў Гайленд Парк, Н. Дж., ЗША, на тую-ж самую дату... – мэта падрыву легітымнага Сабору відавочная. Яго Выс. Ўладыка Ізяслаў адмысловым Архіпастырскім Пасланьнем ад 5/II/84 забараніў духавенству і вернікам усякі ўдзел у гэтым псэўда-саборы ды ўсякія дачыненьні з Мацукевічам і яго клікай – і людзі паслухалі: сяньня ўжо ведаем, што ў тым „саборы" Мацукевіча не прыняла ўдзелу ніводная легітымная парахвія БАПЦ, ніводзін наш духоўнік, ніводзін епіскап. Ня гледзячы на ўсё гэта, Мацукевіч у сваёй лістоўцы апавяшчае, што „З Божай ласкі і па Вашаму выбару (!) на мяне прыпаў цяжкі абавязак узначаліць БАПЦ..." Гэтыя брэдні чалавека затраціўшага сваё сумленьне ёсьць абразай усіх нас, бязбожным зьдзекам над нашай Сьв. Царквою і насьмешкай над Яго законамі.

Стварыўшы хаос у Царкве і зьвёўшы ўвесь працэс праваслаўнай законнасьці да ўзроўню партыйнай махінацыі, гэты яўны злачынец цяпер у сваёй лістоўцы бярэцца вучыць усіх нас хрысьціянскай маралі. Падзяліўшы і разбурыўшы нам парахвіі, ён ехідна цьвердзіць, што „ў нас няма ніводнага такога разыходжаньня, якога нельга было-б залагодзіць праз рассудак і добрую волю" – а як-жа, ды чаму не, калі-б толькі ён схацеў урэшце спыніць сваю разбуральную работу і аставіць нашыя парахвіі ў супакоі! Але-ж ня гэта яму ў галаве, бо яго мэта – канчатковае разбурэньне нашай Сьвятой Царквы. З гэтай мэтай ён узьвёў сябе ў сан „першага герарха" ды падабраў сабе фікцыйныя „новыя кіруючыя й кантрольныя ворганы" – „раду БАПЦ", „кансісторыю" і т.д., каб давесьці Царкву да канчатковай руіны. Вось чаму нельга нам гэтых брэдняў ачмурэлага нягодніка ігнараваць.

Як было паведамлена асобным Камунікатам Кансысторыі ад 1 чэрвеня 1984 г. Трэйці Сабор БАПЦ, што адбыўся 26, 27 і 28 травеня г.г. ў Манчэстары, Англія, прайшоў вельмі ўдала. Амаль усе легітымныя нашыя парахвіі (93%) былі на ім рэпрэзэнтаваныя. Сабор зацьвердзіў Яго Выс. Архіепіскапа Ізяслава на становішчы Першагерарха БАПЦ і надаў яму тытул Мітрапаліта. Тамжа былі выбраныя – новая Рада БАПЦ, Кансысторыя ды Кантрольная Камісія. Паколькі Мацукевіч у сваёй лістоўцы заклікае да „супрацоўніцтва" з ягонай псэўда-кансісторыяй, уважаем за неабходнае прыпомніць духавенству і ўсім вернікам, што і ***надалей астаецца ў сіле забарона*** ўсякіх дачыненьняў з М. Мацукевічам асабіста і з яго клікай, прагалошаная ў Архіпастырскім Пасланьні ад 5/II/84. Маем надзею, што і гэтым разам забарона гэта знойдзе поўнае падтрыманьне сярод нашых людзей добрай волі і такім парадкам Сьв. Царква наша пазьбегне хаосу і развалу.

Просьба да Кіраўнікоў Парахвіяў вывесіць гэты камунікат на дошцы паведамленьняў парахвіі, ці на іншай дарозе пастарацца давесьці яго да ведама ўсіх вернікаў.

– Кансысторыя БАПЦ

19 ліпеня 1984

ВЯСЁЛЫХ КАЛЯДЯЎ
і
Шчасьлівага Новага Году
ўсім падпішчыкам, знаёмым і ўсім беларусам жадае
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ „ЧАС"

РАЗСТРЫЖАНЫ „ПАЯСЬНІЎ" АБ САБЕ

Пасьля доўгага маўчаньня аб разстрыжэньні і выключэньні із БАПЦ былога япіскапа БАПЦ, Ню Ёрская адшчэпніцкая прэса №321 за ліпень-жнівень 1984 г., урэшце піша, што на сваім адшчэпніцкім „саборы" ў Гайленд Парку ў травені г.г., разстрыжаны былы Арх. БАПЦ, цяпер Міхаіл Мацукевіч, „паясьніў, што выключэньні гэныя былі беспадстаўныя, няпраўныя, яны пярэчылі канонам Праваслаўнае Царквы й Статуту БАПЦ, а таму няважныя."

Гэтая няшчасная зацемка вартая заўвагі не таму, што разстрыжаны займаецца самасудам і беззаконьнем, але больш таму, што газэта якае тытулуе сябе „Газэтай Беларусаў у Вольным Сьвеце" недапушчае ніякіх інфармацыяў з другога не-адшчэпніцкага боку й аб Мітрапаліту БАПЦ, Ізяславу. Друкуючы вышэй успомненую зацемку безкрытычна, аднабакова й як-бы ўсё там сказанае было сьвятой праўдай, БАЗАўская газэта „Беларус" зігнаравала вялікую колькасьць дакумантаў выданых Кансысторыяй БАПЦ ў якіх дакладна тлумачыцца чаму Мацукевіч быў разстрыжаны. Гэтай тактыкай той „сьвяты Беларус" сьведама займаецца прапагандай і пашырэньнем адшчэпніцтва. Яшчэ ёсьць шмат іншых падобных прыкладаў сьведамае аднабаковасьці ў „Газэце Беларусаў у Вольным Сьвеце", некаторыя зь якіх успаміналіся ў папярэдніх немарох „ЧАС"у.

Такі прапагандовы падыход да справы ў друку, асабліва да важнай справы, як да Беларускай Нацыянальнай Царквы й да Беларускай Мітраполіі, ня ёсьць адзнакай свабоднай прэсы, асабліва той што прэтэндуе на „Газэту Беларусаў у Вольным Сьвеце", але адзнакай склоннасьці да таталітарнай сыстэмы й рэпрэзэнтуе цэнзуру й палітычную кантролю над прэсай найгоршага тыпу – дарма што гэтая няшчасная прэса называецца „беларускай."

© PDF: Kamunikat.org 2018 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018

© PDF: Kamunikat.org 2018

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018

ПРЫВІТАНЬНІ МІТРАПАЛІТУ Б.А.П.Ц. З МЭЛЬБУРНУ

Яго Высолапрэасьвяшчэнству
Уладыку Ізяславу
Мітрапаліту Сьв. Б.А.П.Царквы

Высокапрэасьвяшчэньнейшы й дарагі Ўладыка!

Ад імя Сястрыцтва пры парахвіі Віленскіх Мучанікаў у Мэльбурне, Аўстралія, ВІТАЕМ ВАС Высокапрэасьвяшчэньнейшы Ўладыка Ізяслаў з прыняцьцем абовязку Першагерарха й аднаразова тытулу Мітрапаліта Сьв. Б.А.П.Царквы, ды жадаем Вам добрага здароў'я, радасьці духовае, непахіснасьці ў абароне сьвятасьці БАПЦарквы, перахаваньні хвалы-годных звычаяў й традыцыяў нашага пабожнага народу, гонару шчырых вернікаў БАПЦарквы ды рэспэкту сярод усіх людзей добрае волі.

Мы шчыра просім Госпада Нашага Ісуса Хрыста аб дараваньні добрага здароў'я ды прадоўжаньні жыцьця Вашага на многія лета!

Дай Божа!
Жнівень, 1984.

З НАРАДЖЭНЬНЕМ ХРЫСТОВЫМ
Вітаем
Высокапрэасьвяшчэннага Ўладыку Мітрапаліта *ІЗЯСЛАВА*
Дастойнае Сьвятарства і ўвесь клер царкоўны, парахвіяльныя Рады, Брацтвы й Сястрыцтвы, ды ўсіх вернікаў Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы і ўвесь Беларускі Народ на Радзіме й на чужыне.

Кансысторыя й Рада БАПЦ

З НАРАДЖЭНЬНЕМ ХРЫСТОВЫМ
і з Новым – 1985 – Годам
Віншуем
Усіх Братоў і Сёстраў у Хрысьце і шлём найшчырэйшыя пажаданьні здароўя і радаснага жыцьця.

Мітрафорны Пратаерэй а. Васіль і Матушка Марыя Кендыш

ПАДЗЯКА за ГАСЬЦІННАСЦЬ на Саборы Б.А.П.Ц.

Дарагія
а. Мітр. Пратэярэй Ян Абабурка,
Царкоўная Рада, Сястрыцтво й Парафіяне Прыходу
Жыравіцкай Божай Маці ў Манчэстары, Англія.

Ад нашае Парафіі Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, а таксама і ад другіх дэлегатаў і гасьцей прысутных на 3-ім Саборы БАПЦ, асьмелюся шчыра Вам усім падзякаваць за Вашую так шчырую гасьціннасьць, якую Вы выявілі пад час нашага пабыту на 3-м Саборы БАПЦ.

Мы вельмі ўдзячныя за тое, што Вы нас так удала закватэравалі, дзе мы мелі выгодныя начлегі, смачна падрыхтаваныя пасілкі, дзьве багатыя бяседы для ўсіх прысутных у царкоўнай залі, а таксама дармовую камунікацыю. Усім гэтым Вы заашчадзілі шмат грошай прыежджым і разам дапамаглі так удала адбыцца Сабору.

Будзем верыць, што Бог пазволіць за 6 год гасьціць Вас на 4-м Саборы ў нас у ЗША. Тымчасам хай Бог пашле Вам сілы й духу ў Вашай сямейнай, царкоўнай і агульна грамадзкай працы.

Мы разьехаліся з найлепшымі аб Вас уражаньнямі і ўспамінаць Вас будзем заўсёды добрымі словамі. Дык яшчэ раз Вялікае Вам беларускае дзякуй за Вашую так дбалую гасьціннасьць, за Вашую сардэчную ветлівасьць і за тыя песьні... і „Бывайце здаровы жывіце багата".

Такімі мы павінныя быць усе беларусы. Нам трэба паважаць адзін другога ды лічыцца з кожным разважаньнем карысным для нашай агульнай беларускай справы.

– Ул. Курыла
Дэлегат 3-га Сабору БАПЦ

„ВАСІЛЬКОВАЕ" ВЯСЕЛЬЛЕ

У нядзелю 23-га верасьня 1984 г. адбылося вясельле Ліды Данілюк з Доналдам Фішэрам. Вянчаў маладых Я.М. Мітрапаліт БАПЦ Ўладыка Ізяслаў у Катэдральным Саборы Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, дзе ў мінулым кіраўніком парафіі быў дзед нарэчанае а. Хведар Данілюк. Узмоцнены хор пад кіраўніцтвам спадарычны Ларысы Курыла прыгожа пяяў шлюбныя песьні ўпяршыню на беларускай мове. У царкве было шмат людзей, сваякоў і прыяцеляў маладых ды іхніх бацькоў. Спадарства Марыя й Барыс Данілюкі прыклалі ўсе стараньні, каб вянчаньне дачкі Ліды было як найбольш урачыстым.

Маладая – Ліда Данілюк ужо шмат год належыць да Беларускага Танцаўнога Ансамблю „Васілёк" ды ўдзельнічае ўсва ўсіх ягоных выступленьнях, як здольная й выдатная танцаўніца. Яе любіць і шануе ўся моладзь і старэйшае грамадзтва за ейную ахвярную нацыянальную дзейнасьць. Маладых-ж сваім прыемным характарам ды прыхільнасьцяй, а нат і памогай у дзейнасьці ансамблю здабыў сабе агульнае прыяньне й сяброўства сярод нашае моладзі й тых старэйшых, што мелі нагоду зь ім сустрэцца. Таму й шмат беларускае моладзі ды й сталых людзей зь Ню Ёрку й ваколіцаў прыйшло на іхні шлюб, каб супольна парадавацца й пажадаць маладым шчасьця ў сямейным жыцьці.

Трэба адзначыць, што сымбаль ансамблю – наш гожы васілёк, уплецены ў букеты маладое й дружак, у кветкавым прыбраньні царквы, вылошкавым колеры сукенкаў дружак ды прышпіленых вясельнікам бутаньерках стаўся матывам гэтага запраўды беларускага вясельля.

Пасьля шлюбу адбылася багатая, вясёлая й поўная ўцехі бяседа ў вадумысловай залі ў Мінэолі, што на Лонг Айлэндзе. Кактэйл і смачны абед, прыемны настрой, музыка й нясупынныя танцы (з агульнай „Лявоніхай") зрабілі гэтае вясельнае прыняцьце адным з найбольш удалых.

А яшчэ сьледам даўняга краёвага звычаю замест паясоў і ручнікоў, якімі ў нас даўней маладая дарыла вясельнікаў, гэтым разам на сталох да ўсіх хіліліся зноў між каласамі нашыя васількі, у аздобленых беларускімі народнымі ўзорамі флянконах, што іх маладая парупілася сама зрабіць. Кожны, хто быў на вясельлі атрымаў гэткі флякончык на ўспамін гэтае радаснае ўрачыстасьці.

Дык дай-жа Божа, каб усё жыцьцё маладых было такое вясёлае й багатае, як іхняе вясельле!

– М. Тулейка

25-ы Юбілей Беларускага Праваслаўнага Прыходу ў Чыкага

(ГРЭЦКАЙ ЮРЫСДЫКЦЫІ)

У нядзелю 20-га лістапада 1983 году Беларуская Праваслаўная Царква Сьв. Юрыя ў Чыкага сьвяткавала свой 25-ці гадовы Юбілей.

Багаслужбы ўзначаліў Чыкагскі грэцкі Япіскап Іаковос з даручэньня Архіяпіскапа Іаковаса, Экзарха Сусьветнага Канстантынопальскага Патрыярха ў Амэрыцы.

Япіскапа Іаковаса й суправаджаючага Яго Архімандрыта Іссая Хранопулоса сябра Царкоўнай Управы М. Латушкін сустрэў у дзьвярах царквы кароткім прывітальным словам з хлебам і сольлю. Япіскап благаславіў сустракаючых, а хор пад кіраўніцтвам рэгэнта парафіі У. Барушкевіча засьпяваў: „Ісполаймы деспота".

Япіскапу Іаковасу саслужылі: Архімандрыт Іссая, Настаяцель прыходу а. Варнава, былы Настаяцель а. Протаіерэй Леў Астроўскі, Протадыякан а. Ільчук В. і дыякан а. Янка Вялюкевіч із Ракфорду.

СьвяточнаяБагаслужба праходзіла вельмі ўрачыста ў залітай сонечным сьвятлом царкве й напоўненай вернікамі. Царкоўны хор падмацаваны харыстамі із Ракфордзкага прыходу Хрыста-Спаса ў якім шмат беларусаў, сьпяваў задушэўна і надхнёна. У ліку сьвяткуючых была вялікая група гасьцей із Ракфорду і другіх асяродкаў.

З навучальнымі пропавядзямі выступаў Япіскап Іаковас і Арх. Іссаія, якія заклікалі праваслаўных беларусаў і ўсіх праваслаўных сьмела паказаць сьвету свае праваслаўныя традыцыі й культуру, якія тут зьяўляюцца часткай кангламэрату амэрыканскай нацыі.

Пад час Багаслужбаў Япіскап Іаковас урачыста ўзьвёў а. Варнаву ў сан Архімандрыта, а парафіяна А. Пілецкага нагарадзіў стіхірам.

За стойкасьць у Хрысьціянскай Веры й усебаковую ахвярнасьць для Беларускай Праваслаўнай Царквы, Япіскап узнагарпдзіў прыхажанаў: Івана Панкевіча, Васіля Пунтуса, Данілу Швэшэля, Івана Дімідіка, Міхася Калініка, Міколу Латушкіна, Кастуся Манжулу, Пятра Нягоду, Анатоля Новіка Косьцю Пупа, Івана Рагалевіча й Івана Зубенку, прыгожа выкананымі Благаславеннымі Япіскапскімі граматамі – такой-жа граматай узнагарадзіў царкоўнага рэгэнта Ўсевалада Барушкевіча, які служыць васемнаццаць гадоў у царкве.

Па заканчэньні літургіі духавенства, госьці й парафіяне сабраліся ў царкоўнай залі на абед падрыхтаваны Сястрыцтвам парафіі.

Закончыўшы літургіі ў сваіх прыходах, прыбылі на ўрачыстасьць і з прывітаньнямі Настаяцель з матушкай прыходу Хрыста-Спаса ў Ракфардзе а. Самуіл Шэрры ды а. Іоан Шоо ад Расейскай Зарубежнай Царквы.

Сьвяточнай урачыстасьцяй кіраваў інж. Іван Касяк. Хвілінай цішыны прысутныя ўшанавалі адышоўшых у вечнасьць.

Прывітаньні ад беларускіх грамадзкіх асяродкаў ЗША і Канады ды ад беларускіх прыходаў і іх Настаяцеляў чытаў сп. Латушкін: ад а. Протапр. Сьвятаслава Каўша, Адміністратара Кансысторы Беларускай Рады Кананічных Беларускіх Прыходаў (Грэцкай юрысдыкцыі – рэд.); ад Прэзыдэнта БЦР др. Мядзейкі; ад Управы Прыходу Еўфрасініі Полацкай у Саўт Рывэры; ад прыходу Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл; ад а. Паўла Вялікага Настаяцеля прыходу Еўфрасініі Полацкай у Таронты і ад іхняй Парафіяльнай Управы; ад паасобных грамадзян якія не змаглі ўзяць удзел у Юбілейным Сьвяткаваньні.

Кароткі рэфэрат на тэму дня чытаў сп. М. Латушкін.

На 25-ці Гадовы Юбілей прыход выдаў невялікую ілюстраваную брашуру ілюструючую прабнг жыцьця прыходу.

З прамовамі на банкеце выступалі: Архіяпіскап Іаковос, Арх. Іссая, а. Леў, а. Шэрры, а. Шоо, новаўведзены ў сан Архімандрыта а. Варнава. Ад беларускіх каталікоў у Чыкага вітаў

(працяг на 8-й бачынцы)

© PDF: Kamunikat.org 2018
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018

© PDF: Kamunikat.org 2018 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018


СЬВ. † ПАМ.

Протпрс. а. Др. Аўген СМАРШЧОК

Сябры й Настаяцелі Рады Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Вялікай Брытаніі з глыбокім жалем і смуткам выражаюць найсардэчнейшыя і найшырэйшыя спачуваньні асірацелай Матушцы Зоі зь сямейкай.

Хай лёгкім пухам Яму будзе Бэльгійская зямелька на Вечную Памяць!

Мітр. Прат. а. Янка Абабурко
Прт. а. Ян Пекарскі
Рада БАПЦ у Вялікай Брытаніі



ПРОТАПРАСЬВІЦЕР БАПЦ ДР. АЎГЕН СМАРШЧОК
29–IX–1914 –– 5–X–1984

(Архіўная фатаграфія з 2-га Сабору БАПЦ, 27-29 травеня 1972 г.)

Па волі Божай, 5-га кастрычніка сёлета неспадзявана адыйшоў на вечны супачынак Протапрасьвіцер Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы Др. Аўген Смаршчок.

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква на Чужыне страціла выдатнага пастыра й беларускага патрыёта.

Айцец Протапрасьвіцер Аўген Смаршчок нарадзіўся 29-га верасьня 1914 году ў м.Зэльва к.Ваўкавыскага, Слонімскага павету на Беларусі. Сын селяніна (настаўніка) і сваяк вядомае беларускае паэткі Ларысы Геніюш. Пачатковую школу скончыў у Зэльве ў 1929 годзе, пасьля чаго паступіў у Сьвіслацкую Настаўніцкую Сімінарыю якую скончыў у 1934 годзе.

У выніку Другое Сусьветнае вайны апынуўся ў Заходняй Нямеччыне, дзе прадаўжаў сваю асьвету, закончыўшы філязафічны факультэт Марбурскага Унівэрсытэту ў ліпені 1950 году. 16–га жніўня гэтага-ж году ажаніўся з Зояй Жэлязоўскай. Будучы беларускім праваслаўным патрыётам, бачачы вялікую патрэбу сьвятарства для адроджанае Беларускай Аўтакефальнай Царквы на Чужыне, пастанавіў прыняць Ярэйскі сан, здаючы сабе справу з цяжкасьцяў ахвярнае працы на пастырскай ніве служэньня Богу й свайму Беларускаму Народу. Чын пасьвячэньня ў сан Ярэя выканаў Епіскап Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы Васіль (Тамашчык) у Украінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве ў Мюнхане. Пасьля гэтага, Айцец Аўген з Матушкай выехалі ў Бэльгію, дзе ён распачаў пастырскую дзейнасьць Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы сярод аселеных там беларусаў і іншых праваслаўных. Матушка Зоя, маючы дыплём фармацэўта атрымала працу па сваёй спэцыяльнасьці, што складала падставу матэрыяльнага жыцьця сям'і. У тым часе ў бэльгійскім горадзе Лювэне знаходзілася значная колькасьць беларускіх праваслаўных студэнтаў, дзе а.Аўген меў капліцу дзе адбываліся нармальныя Божыя службы. Царкоўным студэнцкім хорам кіраваў вядомы беларускі кампазытар Мікола Равенскі, што зьяўлялася прыцягваючым мамэнтам большае прысутнасьці на багаслужбах адпраўляных айцом Аўгенам.

Па пэўным часе а.Аўген распачаў далейшыя студыі на атрыманьне навуковае ступені доктара, пасьля чаго пэвен час выкладаў на Унівэрсытэце.

За сваю 34 гадовую ахвярную службу а.Аўген быў узнагароджаны епіскапскімі Ўзнагароднымі Граматамі й найвышэйшым сьвятарскім санам Протапрасьвіцера, ды быў прызначаны Кіраўніком Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на Заходнюю Эўропу.

Глыбока спачуваючы дарагім Матушчы й сыном Андрэю й Пятру ў іхнім цяжкім горы й смутку ў страце Айца Протапрасьвіцера Аўгена, мы будзем маліцца й прасіць Госпада нашага Ісуса Хрыста, каб Ён Дабратлівы прыняў душу адышоўшага ў Сваё Валадарства Нябеснае. Вечная Памяць!

– Протапрасьвіцер Васіль Кендыш

Сабор Б.А.П.Ц.

(працяг з 5-й бачынкі)

(„Хрыстос васкрэсе...") прапяянай усімі, пасьля чаго ў дзелавой атмасфэры Сабор перадыскутаваў і прыняў прадстаўленыя Рэзалюцыйнай Камісіяй дзьве рэзалюцыі: адну агульнага характару, даволі кароткую, і другую, шмат даўжэйшую, у справе дысыдэнцкіх парахвіяў. У арганізацыйных справах найбольш часу і ўвагі дэлегаты прысьвяцілі разгляду цяжкой фінансавай сытуацыі нашай Сьв. Царквы. Усе згадзіліся з тым, што адзінае рэальнае лякарства на гэту біду ляжыць у павышанай ахвярнасьці ўсіх, каму дарагая родная Царква.

Каля гадзіны 1-ай па паўдні ўсе прысутныя (а трэба прызнаць, што ніхто з дэлегатаў не пакінуў Сабору раней!) у шчырай малітве ўдзячнасьці дзякавалі Ўсемагутнаму за тры дні памысна праведзеных нарадаў у духу поўнага зразуменьня крытычнага мамэнту ў жыцьці нашай Сьвятой Царквы. Падзякаваўшы ад імя ўсіх гаспадаром за дасканала зарганізавалае прыняцьце дэлегатаў і гасьцей Уладыка Мітрапаліт на гэтым зачыніў Трэйці Звычайны Сабор БАПЦ. Разьвітваючыся ўсе пажадалі ўзаемна спаткацца ў лепшых абставінах на Чацьвертым Саборы ў 1990 годзе.

NEW YORK
REAGAN-BUSH '84
The President's Authorized Campaign Committee

Dr. Roger Horoshko
9–06 Parsons Blvd.
Whitestone, N.Y. 11357

November 9, 1984

Dear Friend:

It has been a wonderful experience to work with you as Co-Chairman of the Byelorussian Americans for Reagan-Bush '84. We can be proud that our efforts were rewarded in the results on Election Day!

I hope our fruitful relationship will continue and grow in years to come for the mutual benefit of the Republican Party, its Candidates, and our friendship.

I know that the Campaign Team joins me in thanking you for all your hard work for Victory.

Wih my personal best wishes, I am,

Sincerely yours,
Alfred Hong
(Chairman New York State Republican Heritage Council)



For the Byelorussian-American Republican Club of New York, the busy Presidential campaign season was highlighted by a rally and a banquet held on Oct. 28, 1984, in the Chinatown in New York. More than 500 persons attended the affair which, in addition, featured folk art, music and dance by the nationality groups. It is regretable that Byelorussian dissidents sabotaged the proposed Byelorussian folk presentation.

Photographs depict: (ABOVE) Alfred Hong, Chairman of the New York State Republican Heritage Groups Council and R. Horoshko, Chairman of the Byelorussian-American Republican Club of New York, at the podium. (BELOW) From left to right: Mrs. Alfred Hong, State Senator Roy Goodman, an unknown woman, R. Horoshko and Michael Sotirhos, Chairman of the National Republican Heritage Groups Council.



25-Ы ЮБІЛЕЙ

(працяг з 7-й бачынкі)

др. В. Рамук. Ад Украінскага Кангрэсавага Камітэту Амэрыкі і „Сэкюрыты савінг анд лоан асоцыэйшан" вітаў Юліян Куляс.

На заканчэньне афіцыйнай часткі праграмы сп. І. Касяк падзякаваў Япіскапу і ўсяму духавенству, гасьцям, асабліва ракфордцам, парафіянам-казакам і ўсім прысутным. Малітвай была закончана ўрачыстасьць.

Пасьля заканчэньня, знаёмыя сустракаліся, іншыя сьпявалі беларускія песьні – заля дыхала беларускасьцю. Людзі весяліліся й адпачывалі каб у наступны дзень з новымі сіламі спаткацца із штодзёнымі жыцьцёвымі праблемамі рэальнага жыцьця.

– М. Латушкін

АЙЦЕЦ РАДЭНКОВІЧ ВЯРНУЎСЯ ДА СЭРБСКАЕ ЦАРКВЫ

25-га верасьня г.г. Мітрафорны Протаерэй Гадзі Александар Радэнковіч атрымаў ад Мітрапаліта БАПЦ Ізяслава Адпускную Грамату і вярнуўся да Вольнае Сэрбскае Царквы.

Айцец Радэнковіч і ягоная сэрбская парафія Сьв. Вялікамужаніка Георгія ў Барбентоне, Огае, належала да БАПЦ ад 26-га ліпеня 1980 году.

Адшчэпніцкія інтрыгі ня мінулі а. Радэнковіча. Ашуканствам і фальшам адшчэпнікі ўпісалі а. Радэнковіча і ягоную парафію да свайго адшчэпніцкага „сабору" ў Гайленд Парку, дзе а. Радэнковіч ніколі ня быў і за што пазьней перапрошваў Мітрапаліта (гл. б.4).

© PDF: Kamunikat.org 2018 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018